*А. У. Ерашэвіч*
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, Мінск

*A. Yerashevich*
Belarus State Economic University, Minsk

**УДК [94(476)+330.567.4:369(476)(091)]«18»**

# ДЗЯРЖАЎНАЯ ГРАШОВАЯ КАМПЕНСАЦЫЯ МАТЭРЫЯЛЬНЫХ СТРАТАЎ ПАГАРЭЛЬЦАМ ГАРАДОЎ І МЯСТЭЧАК БЕЛАРУСІ (30–50-я гг. XIX ст.)

# THE STATE MONETARY INDEMNIFICATION OF A MATERIAL DAMAGE FIRE VICTIMS CITIES AND PLACES OF BELARUS

*Артыкул прысвечаны праблеме аказання дзяржаўнай грашовай дапамогі пагарэльцам гарадоў і мястэчак Беларусі ў 30–50-я гг. XIX ст. Даследаванне заснавана на вывучэнні як апублікаваных заканадаўчых крыніц (з Поўнага збору законаў Расійскай імперыі), так і на выкарыстанні значнай колькасці неапублікаваных архіўных дакументаў і матэрыялаў. Аўтар паспрабаваў ацаніць памеры матэрыяльных стратаў маёмасці жыхароў гарадоў і мястэчак Беларусі ад пажараў у грашовым выражэнні, ахарактарызаваў нарматыўна-прававыя акты, якія рэгламентавалі памеры, парадак і правілы выдачы грашовых пазыкаў і беззваротнай дапамогі для асобаў, якія пацярпелі ад пажараў, прааналізаваў мерапрыемствы ўладаў па аказанні грашовай дапамогі пагарэльцам, вызначыў некаторыя формы і метады грашовых кампенсацый матэрыяльных стратаў пагарэльцам гарадоў і мястэчак Беларусі ў 30–50-я гг. XIX ст. з боку дзяржавы.*

*Ключавыя словы: дзяржаўная дапамога; стыхійныя бедствы; надзвычайныя сітуацыі; пажар; погарэльцы; урон; грашовая кампенсацыя.*

*This article deals with the problem of rendering of the state monetary help fire victims cities and places of Belarus in the 1830−1850th. The research material is selected from Complete Legal Code of the Russian Empire and based of the unpublished documents and materials from National Historical Archives of Belarus. The author has made an attempt to estimate the sizes of the material damage of property of inhabitants of cities and places in Belarus from fires in money terms. The study is described legal acts which regulated the sizes, an order and rules of delivery of money advances and the irrevocable help to the persons who have suffered from fires. The author has analysed actions of the authorities for rendering of the monetary help fire victims, has defined some forms and methods of state monetary indemnifications of material losses fire victims cities and places of Belarus in 30–50th of XIX century.*

*Key words: state aid; natural disasters; emergency situations; fire; fire victims; a damage; monetary indemnification.*

Сярод экстрэмальных пагрозаў і надзвычайных сітуацый антрапагеннага характару ў мінулым вылучаліся пажары, праявы і вынікі якіх аказвалі значны ўплыў на паўсядзённае жыццё традыцыйнага аграрнага грамадства Расійскай імперыі канца XVIII – першай паловы XIX ст. Вынікам пажараў з’яўляліся як значныя матэрыяльныя (маёмасныя), так і істотныя сацыяльныя і маральна-псіхалагічныя страты. Для гарадскіх

паселішчаў наступствы разгулу вогненнай стыхіі заключаліся ў зменах іх экалагічнага стану, пераменах у навакольным асяроддзі. Відавочна, што пажары мелі важныя сацыяльна-эканамічныя наступствы, уплывалі на далейшае развіццё інфраструктуры гарадоў і мястэчак (у тым ліку іх жылой забудовы), ускладнялі маёмасныя перспектывы іх жыхароў. Зразумела, што ад маштабаў і інтэнсіўнасці пажараў залежалі ступень захаванасці розных відаў матэрыяльных і культурных каштоўнасцей, памеры стратаў рухомай і нерухомай маёмасці. Ва ўсялякім разе пажары абумоўлівалі неабходнасць стварэння сістэмы кампенсацый стратаў пацярпелым ад іх знішчальных наступстваў і пабудовы адмысловага фінансавага механізма аказання грашовай дапамогі з боку дзяржавы, грамадскіх арганізацый, прыватных асобаў.

Улік традыцый і асэнсаванне станоўчага гістарычнага вопыта праблемы дзяржаўнай грашовай дапамогі пацярпелым ад пажараў жыхарам гарадоў і мястэчак Беларусі ў XIX ст. неабходны для выпрацоўкі практычных рэкамендацый для ўдасканалення працэдуры вызначэння грашовых кампенсацый пагарэльцам і на сучасным этапе развіцця грамадства.

Працэс фарміравання сістэмы пажарнай бяспекі, этапы развіцця пажарнай службы Беларусі ў XIX–XX стст. даследаваў В. І. Якаўчук [18; 19]. Аднак ён не закрануў праблему дзяржаўнай і прыватнай грашовай дапамогі пацярпелым ад пажараў жыхарам беларускіх гарадоў і мястэчак у першай палове XIX ст.

Мэта артыкула заключаецца ў спробе вызначэння механізма і асноўных інструментаў дзяржаўнай грашовай дапамогі (кампенсацыі матэрыяльных стратаў) пацярпелым ад пажараў жыхарам гарадоў і мястэчак Беларусі ў 30–50-я гг. XIX ст. Для вырашэння пастаўленай мэты аўтар пазначыў наступныя навуковыя задачы: 1) на канкрэтных прыкладах ацаніць памеры матэрыяльных стратаў маёмасці жыхароў гарадоў і мястэчак Беларусі ад пажараў у грашовым выражэнні; 2) ахарактарызаваць асновы прававога рэгулявання праблемы аб памерах, парадку і правілах выдачы грашовых пазыкаў і беззваротнай дапамогі для асобаў, якія пацярпелі ад пажараў; 3) прааналізаваць мерапрыемствы ўладаў па аказанні грашовай дапамогі пагарэльцам, паспрабаваць вызначыць структуру падобных грашовых асігнаванняў, выявіць некаторыя формы і метады кампенсацый матэрыяльных стратаў з боку дзяржавы пагарэльцам гарадоў і мястэчак Беларусі ў 30–50-я гг. XIX ст. З прычыны абмежаванасці аб'ёма артыкула не ўсе сюжэты атрымалі ў ім закончаны разгляд, а аспекты пастаўленай праблемы раскрыты з дастатковай паўнатой.

Артыкул грунтуецца на вывучэнні як апублікаваных заканадаўчых крыніц (з Поўнага збору законаў Расійскай імперыі), так і ўводзе ў навуковы зварот значнай колькасці неапублікаваных дакументаў і матэрыялаў з фондаў Нацыянальных гістарычных архіваў Беларусі ў Мінску і Гродне, Літоўскага дзяржаўнага гістарычнага архіва ў Вільнюсе. Частка архіўных матэрыялаў з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Мінску

адносна арганізацыі пажарнай службы, супрацьпажарных мер мясцовых улад па папярэджванні і дзеяннях па ліквідацыі наступстваў вогненнай стыхіі ў гарадах Мінскай губерні ў 1793–1853 гг. сабрана ў зборніку дакументаў беларускім даследчыкам А. Гоціным [1].

З пункту гледжання коштаў стратаў нерухомай і рухомай маёмасці паводле грашовай ацэнкі (больш за 50 тыс. руб. серабром ці 150 тыс. руб. асігнацыямі) у вызначаны аўтарам храналагічны прамежак часу вылучаліся пажары ў губернскіх цэнтрах [у Мінску (30.05.1835 г.), Магілёве (25.05.1847 г., 21.07.1848 г., 13.05.1860 г.), Віцебску (у ноч на 25.04.1852 г., 7.06.1855 г., 25.06.1856 г.)], ва ўездных гарадах Віцебскай [у Полацку (1848 г.), Лепелі (28.04.1833 г.)], Магілёўскай [у Мсціслаўлі (03.1838 г.), Рагачове (11–12.10.1856 г.)], Гродзенскай [у Брэсце (25–26.02.1847 г., 17.06.1858 г.), Слоніме (10–11.07.1848 г.)], Мінскай [у Пінску (19.07.1848 г.), Бабруйску (13.08.1850 г., 13–14.08.1854 г., 13.08.1857 г.), Мазыры (11–12.06.1839 г.), Нясвіжы (19.07.1836 г.)], Віленскай [у Відзах (24.08.1835 г.), Ашмянах (08.1837 г.), Дзісне (10–11.01.1849 г.)] губерняў, у шэрагу мястэчкаў Мінскай [у Давід-Гарадку (22–23.04.1839 г.), Карэлічах (23.09.1855 г.), Стоўбцах (20–21.09.1858 г.), Глуску (13.05.1860 г.)], Гродзенскай [у Камянцы-Літоўскім (27–28.03.1851 г.), Індуры (1852 г.), Моталі (29.03.1860 г.), Віцебскай [у Чарэі (31.05.1859 г.), Глыбокім (17.08.1859 г.), Магілёўскай [у Веткі (у ноч на 7.05.1853 г.), Шумячах (1857 г.), Бялынічах (16.08.1859 г.)] губернях [5–10; 13].

Ацэнка коштаў стратаў нерухомай (розныя тыпы жылых, грамадскіх, урадавых, гаспадарчых пабудоваў) і рухомай маёмасці вызначалася як самімі пагарэльцамі, так і паліцэйскімі служыцелямі, звесткі ад якіх паступалі ў генерал-губернатарскія і губернатарскія канцылярыі, а таксама ў спецыяльна ствараемыя розныя камітэты і камісіі, якія арганізоўваліся, як правіла, пры грамадзянскіх губернатарах з мэтай устанаўлення памераў матэрыяльных стратаў і для аказання дапамогі асобам, пацярпелых ад пажараў [11; 12].

Зразумела, што першасныя і выніковыя паказчыкі матэрыяльных стратаў пагарэльцаў значна адрозніваліся паміж сабой. Так, страты жыхароў горада Лепеля ад пажара ў ноч на 28.04.1833 г. гарадскі галава вызначыў у суме да 950 тыс. руб. [8, спр. 6951, л. 3 адв.], аднак урадавая Камісія паменшыла іх больш чым у 3 разы (да 302 710 руб., у тым ліку рухомай маёмасці да 162 990 руб. і будынкаў на 139 720 руб.) [8, спр. 6951, л. 17–22; 32–32 адв.].

Вельмі складанай задачай для мясцовых чыноўнікаў быў улік і ацэнка ў грашовым эквіваленце стратаў ад полымя розных тыпаў і відаў рухомай і нерухомай маёмасці гарадскіх, грамадскіх і прыватных уласнікаў. Часам падобныя звесткі збіраліся рознымі ведамствамі, не абагульняліся і цалкам не сістэматызаваліся. Прынамсі, паводле звестак прысяжных, паказаных цэнаўшчыкамі ў мінскай управе паліцыі, страты жыхароў ад пажара 30.05.1835 г. у Мінску склалі 571 250 руб. асігнацыямі (нерухомай маёмасці ў 398 300 руб., рухомай маёмасці – у 172 950 руб.) [6, спр. 523, л. 25–32 адв.].

Па іншых звестках, пажар 30.05.1835 г. у Мінску прычыніў страты будынкам духоўнага ведамства да 75 тыс. руб., казённым будынкам – да 50 тыс. руб., дамам прыватных уладальнікаў – на 411 400 руб., жыхарам у рухомай маёмасці – на 174 650 руб. Шкода рухомай уласнасці чыноўнікаў і іншых асоб склала 136 289 руб., казённай маёмасці гімназіі – 10 310 руб., купецтва ў выглядзе тавараў – 19 950 руб. [6, спр. 523, л. 49 адв. –50, 52–53].

Адным словам, узровень стратаў нерухомай маёмасці ў гарадах і мястэчках залежыў ад кошту грашовай ацэнкі будынкаў рознага тыпу і віду. Зразумела, што значны ўрон ад пажараў у гарадах мог вынікаць з прычыны знішчэння ці сапсавання полымем асабліва дарагіх каменных збудаванняў, гандлёвых крамаў з таварамі і інш.

Паводле хадатайніцтваў мясцовага начальства, пагарэльцам аказвалася грашовая дапамога з дзяржаўнага казначэйства, за кошт грамадскіх арганізацый і прыватных асобаў. Адпаведна сенацкага ўказа ад 27.07. 1797 г. просьбы аб дазваленні дапамогі пацярпелым ад пажараў гарадам і іншым паселішчам паступалі ад губернатараў на разгляд у Сенат [16].

Незалежна ад матэрыяльнай падтрымкі (у грашовай і натуральнай формах) пагарэльцам даваліся розныя льготы, якія, у асноўным, заключаліся ў дараванні ці растэрміноўцы плацяжу дзяржаўных падаткаў і іншых збораў, скасаванні ўзносу грошай працэнтнага збора па пастойнай павіннасці ў гарадах для зноў адбудаваных пасля пажараў будынкаў (для каменных – на 10 год, драўляных на каменным фундаменце – на 6 год, драўляных – на 4 гады) [17].

У 1850-х гг. больш дакладна рэгламентаваліся памеры, парадак і правілы выдачы грашовых пазыкаў і беззваротнай дапамогі для асобаў, пацярпелых ад пажараў. У канцы 1853 г. міністр унутраных спраў атрымаў дазвол прызначаць невялікую грашовую дапамогу гарадскім жыхарам, пацярпелым ад пажараў, з разліку да 50 руб. серабром для кожнага пагарэльца з дапаможнага капітала Міністэрства ўнутраных спраў [3, 1853, № 11, отд. 1, с. 6–7; 15]. У 1854 г. было санкцыяніравана права аб асігнаванні асобным пагарэльцам да 300 руб. серабром грашовай дапамогі з дзяржаўнага казначэйства пасля ўзаемнай дамовы міністэрстваў унутраных спраў і фінансаў, без асобнага дазвола на кожны падобны выпадак [3, 1854, № 9, отд. 1, с. 14–15; 14].

Сума пазыкаў і аднаразовай беззваротнай дапамогі пагарэльцам адпавядала прапорцыі абвешчанай імі страты рухомай і нерухомай маёмасці. Адпаведна 3-га пункта цыркуляра Міністэрства ўнутраных спраў ад 18.09. 1854 г. аб дапамозе асобам, якія пазбавіліся маёмасці з прычыны пажараў, пазыкі даваліся з разліку 1/3 часткі стратаў нерухомай, незастрахаванай маёмасці. Цыкулярам ад 13.02.1859 г., калі страты пагарэльцаў у нерухомай маёмасці ацэньваліся сумай менш за 60 руб. серабром, замест грашовых пазыкаў прадугледжвалася беззваротная дапамога адпаведна 1/10 часткі стратаў [9, л. 9]. У цэлым пагарэльцы маглі атрымаць сумы аднаразовай беззваротнай дапамогі ў памеры не больш за 1/10 часткі ацэнкі страчанай

рухомай маёмасці, а ў пазыку на пэўных умовах – да 1/3 часткі пазбаўленай нерухомай маёмасці. Раздача сумаў мусіла ажыццяўляцца асобамі мясцовага кіравання пад старшынствам уезднага прадвадзіцеля дваранства [3, 1860, ч. 43, № 7, отд. 1, с. 29, 39].

Дзяржаўныя грашовыя паступленні на карысць пагарэльцаў беларускіх гарадоў і мястэчак у 30–50-я гг. XIX ст. паступалі з капітала, вызначанага для дапамогі пацярелым (так званы дапаможны капітал Міністэрства ўнутраных спраў), ці выдаткоўваліся з дзяржаўнага казначэйства. Найбольш значныя сумы грашовай дапамогі атрымалі пагарэльцы Мінска (у 1835 і 1836 гг. больш за 200 тыс. руб. асігнацыямі, у тым ліку з дзяржаўнага казначэйства 6503 руб. асігнацыямі і 517 руб. серабром у дапамогу 17 чыноўнікам, на пабудову згарэлых дамоў 175 тыс. руб. асігнацыямі (50 тыс. руб. серабром) у пазыку на 12 год без працэнтаў з выплатай пасля 2-х льготных у наступныя 10 год штогод роўнымі часткамі без плацяжу працэнтаў, 25 тыс. руб. асігнацыямі на першую дапамогу пагарэльцам без звароту) [3, 1835, № 9, с. V–VIII; 7, л. 412–413], Брэста (у 1835 г. не менш 175 тыс. руб. асігнацыямі), Полацка (у 1837 і 1839 гг. больш 150 тыс. руб. асігнацыямі, у тым ліку пагарэльцам было раздадзена на неабходную дапамогу ад імя імператара 50 тыс. руб. асігнацыямі, выдзелена 50 тыс. руб. асігнацыямі (выдана 41 500 руб. асігнацыямі) у пазыку на 10 год без працэнтаў на пабудову пагарэўшых дамоў з уплатай пасля 4-х льготных год у наступныя 6 год, 50 тыс. руб. асігнацыямі ў пазыку ад міністра фінансаў на 12 год без працэнтаў для пабудовы гандлёвых крамаў; сума Полацкага дабрачыннага камітэта на карысць пацярпелых ад пажару, ахвяраваная жыхарамі імперыі, склала на 15.06.1837 г. 36960,35 руб. асігнацыямі) [2, с. 684; 8, спр. 10953, л. 84–87, спр. 11620, л. 65 адв., 66, 69, 100 адв.], Магілёва (у 1848 і 1849 гг. жыхарам Магілёва, пацярпелых ад пажараў 1847 і 1848 гг., на пабудову дамоў было пазычана з дзяржаўнага казначэйства 42 120 руб. серабром з уплатай сумы і працэнтаў па 15-гадовых банкаўскіх правілах з прадастаўленнем пазычальнікам 2-х льготных год з прыняццем працэнтаў за гэтыя гады на кошт казны) [10, л. 1–1 адв.], Бабруйска (у 1855 г. больш 90 тыс. руб. серабром, у тым ліку 105 жыхарам, пазбаўленым адной рухомай маёмасці на суму 22 569 руб., было прызначана да выдачы ў беззваротную дапамогу з дзяржаўнага казначэйства 1596,9 руб., а 164 пагарэльцам, якія пазбавіліся нерухомай маёмасці на 228 650 руб., было загадана выдаць у пазыку 86 216,66 руб. з зваротам пасля 3-х льготных год у наступныя 9 год па 5 % і за льготныя годы роўнымі часткамі, асобна для 9 яўрэйскіх сем’яў для перабудовы дамоў у пазыку 1950 руб. з зваротам пасля 2-х льготных год у наступныя 10 год роўнымі часткамі штогод з 5 % і за льготныя годы і інш.) [6, спр. 1330, л. 3–4], Гомеля (у 1857 г. 336 асобам было выдзелена 10289,9 руб. без звароту, а 220 чал. – 123 642,44 руб. з зваротам у наступныя гады), Мсціслаўля (у 1858 г. 514 асобам было асігнавана 15 519,05 руб. без звароту, а 224 асобам – 116 641 руб. у пазыку і інш., у 1859 г. 303 асобам – 15519,05 руб. без звароту, 224 асобам – 116 641 руб. у пазыку) і г. д. [3].

Пэўнае уяўленне аб адносным паказчыку кампенсацый з боку дзяржавы для пагарэльцаў гарадоў і ўездаў Мінскай губерні за 1857–1860 гг. даюць ніжэйпрыведзеныя даныя, з якіх вынікае, што кампенсацыйныя выплаты значна вагаліся па асобных гадах (табл. 1).

*Табліца 1*

**Памеры кампенсацыйных выплат з казны для пагарэльцаў Мінскай губерні за 1857–1860 гг. [4, с. 526–527]**

| Год | Колькасць пажараў | Колькасць згарэлых пабудоваў | Ацэнка стратаў знішчанай маёмасці, руб. сер. | Колькасць выданых з казны пазыкаў, руб. сер. | Адносны паказчык кампенсацыйных выплат, % |
|---|---|---|---|---|---|
| 1857 | 120 | 450 | 444 847 | 20828,8 | 4,7 |
| 1858 | 105 | 800 | 509 359 | 22021,59 | 4,3 |
| 1859 | 116 | 565 | 180 282 | 45112,33 | 25 |
| 1860 | 97 | 311 | 104 790 | 32931,81 | 31,4 |

Такім чынам, пакрыццё панесеных пагарэльцамі беларускіх гарадоў і мястэчак у 30–50-я гг. XIX ст. матэрыяльных стратаў ажыццяўлялася як у натуральнай (даванне рознага роду і якасці рэчаў, у асноўным будаўнічых матэрыялаў), так і ў грашовай (разнавіднасці грашовых выплат, льгот і кампенсацый з розных крыніцаў) формах. Маёмаснае страхаванне як спосаб грашовых кампенсацый матэрыяльных стратаў асобаў, пацярпелых ад пажараў, у дадзены перыяд яшчэ не атрымала значнага развіцця.

Пры вызначэнні памераў маёмаснага ўрону рухомай уласнасці і пры ацэнкі характару разбурэнняў розных збудаванняў улічваліся толькі рэальныя шкоды, звесткі аб якіх збіраліся ці шляхам вуснага апытання саміх пацярпелых, ці паводле іх сведчанняў, радзей у выніку рэвізій урадавых чыноўнікаў. Зразумела, што адстутнічаў механізм выяўлення іншых відаў маёмасных шкодаў (такіх, напрыклад, як неабходнасць пагарэльцам рабіць непрадбачаныя выдаткі, затраты ці ажыццяўляць залішнія выплаты на набыццё рознай маёмасці ці яе аднаўленне, страты імі некаторых рэчаў і грошай, урон ад рэальнага памяншэння вартасці маёмасці ў наступныя гады, пагаршэння яе стану, ад недаатрымання даходу (прыбытку) ці ўпушчанай выгады ў выніку знішчэння гандлёвых крам, прамысловых прадпрыемстваў і інш.), так і стратаў немаёмаснага (маральнага) характару.

Працэс грашовай кампенсацыі панесеных пагарэльцамі стратаў і выдаткаў уключаў працэдуру іх ацэнкі ў грашовым эквіваленце, пакрыцця, выканання даўгавых абавязкаў (вяртанне даўгоў). Дзяржаўная фінансавая падтрымка асобным катэгорыям пагарэльцаў заключалася ў выдзяленні ім з дзяржаўнага казначэйства і іншых крыніцаў розных сум грашовай дапамогі звычайна ў доўгатэрміновую (звычайна на 12 год) пазыку на розных умо-

вах і тэрмінах яе звароту, у адтэрміноўцы выплат па ранейшых пазыках, дзяржаўных падатках і зборах, павіннасцях, даванні розных льгот. У цэлым магчымасці цэнтральных і мясцовых уладаў у справе абароны насельніцтва беларускіх гарадоў і мястэчкаў у 30–50-я гг. XIX ст. ад спусташальных наступстваў пажараў і грашовай кампенсацыі стратаў былі абмежаваныя, у асноўным распаўсюджваліся на асобныя катэгорыі пацярпелых жыхароў.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Готин, А. А.* Организация пожарного дела в городах Минской губернии в 1793–1853 гг. документы и материалы: сборник [Электронный ресурс] / А. А. Готин. – Минск, 2013. – 1 электрон. опт. диск (DVD-ROM). – 321 с., 99 ил.

2. *Жиркевич, И. С.* Записки генерала Ивана Степановича Жиркевича 1789–1848 / И. С. Жиркевич // Русская старина. – 1890. – № 9. – С. 667–706.

3. Журнал Министерства внутренних дел. – СПб.,1835, 1853, 1854, 1860.

4. *Зеленский, И.* Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Минская губерния / И. Зеленский. – СПб.: Военная тип., 1864. – Ч. 2. – VIII, IV, V, 701 с., 17 табл., карта.

5. Литовский государственный исторический архив в Вильнюсе. – Фонд 378 (общий отдел).

6. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ) г. Мінск. – Фонд 295. – Воп. 1. – Спр. 523, 1330.

7. Тамсама. – Фонд 333. – Воп. 1. – Спр. 744.

8. Тамсама. – Фонд 1297. – Воп. 1. – Спр. 6951, 10953, 11620.

9. Тамсама. – Фонд 1430. – Воп. 1. – Спр. 30437.

10. Тамсама. – Фонд 2001. – Воп. 1. – Спр. 645.

11. Тамсама. – Фонд 2942. – Лепельская комиссия по раздаче ссуд погорельцам. – Д. 1–7. – 1835–1839 гг.

12. Тамсама. – Фонд 2291. – Могилёвский губернский комитет по выдаче ссуд и пособий жителям г. Могилёв, пострадавшим от пожара. – Д. 1–22. 1– 848–1856 гг.

13. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ) г. Гродна. – Фонд 1.

14. О порядке назначения денежных из казны пособий в частных пожарных случаях: высочайше утверждённое 27.07.1854 г. положение Комитета министров, объявленное Сенату министром внутренних дел // Полное собрание законов Российской империи: собрание 2-е с 1825 по 1881 г.: в 55 т. – СПб.: Типография 2-го отделения собственной его императорского величества канцелярии, 1830–1862.– Т. 29-1. – № 28445. – С. 720–721. (Далей – ПСЗ-2).

15. О предоставлении министру внутренних дел назначать небольшие денежные пособия городским жителям, пострадавшим от пожаров: высочайше утверждённое 13.10.1853 г. положение Комитета министров, объявленное Сенату министром внутренних дел // ПСЗ-2. – Т. 28-1. – № 27606. – С. 479.

16. О представлении начальниками губерний в Сенат положения о пособиях городам и селениям, потерпевших несчастие от пожара: сенатский указ 27.07.1797 г. // Полное собрание законов Российской империи: собрание 1-е с 1649 по 12 декабря 1825 г.: в 45 т.– СПб.: Типография 2-го отделения собственной его императорского величества канцелярии, 1830. – Т. 24. – № 18061. – С. 662.

17. О распространении льготы от платежа постойной повинности на строения, возобновляемые после пожаров: сенатский указ 19.06.1842 г. по высочайшему повелению // ПСЗ-2. – Т. 17-1. – № 15769. – С. 681.

18. *Яковчук, В. И.* Пожарная служба Беларуси: история развития / В. И. Яковчук; науч. ред. Н. М. Забавский. – Минск: БГПУ, 2005. – 419 с.
19. *Яковчук, В. И.* Пожарная служба Беларуси в первой половине XIX века / В. И. Яковчук // Гістарычна-археалагічны зборнік. – 2008. – Вып. 24. – С. 70–73.

**(Дата падачы: 20.02.2017 г.)**

*Ю. Г. Ермак*
Гродненский государственный университет имени Янки Купалы, Гродно

*Y. Yarmak*
Yanka Kupala State University of Grodno, Grodno

**УДК 94:61(476)«18/19»**

# УЧАСТИЕ ЖЕНЩИН ИУДЕЙСКОГО ВЕРОИСПОВЕДАНИЯ В РАЗВИТИИ МЕДИЦИНСКОЙ СИСТЕМЫ БЕЛАРУСИ (ВТОРАЯ ПОЛОВИНА XIX – НАЧАЛО XX ВЕКА)

# THE PARTICIPATION OF JEWISH WOMEN IN MEDICAL SYSTEM OF BELARUS (SECOND HALF OF XIX TH – THE BEGINNING OF XX TH CENTURY)

*В статье рассмотрено участие женщин иудейского вероисповедания в развитии системы здравоохранения Беларуси во второй половине XIX – начале XX века. В качестве источников используются архивные документы из Национального исторического архива в Гродно и Минске. В сфере медицины иудейкам были доступны такие специальности, как акушерство, зубоврачебное дело, работа в аптеках в качестве помощниц, реже – фармацевтов. Рассмотрены юридические и социально-экономические условия деятельности, в которых приходилось трудиться женщинам-дантистам, повивальным бабкам, содержательницам аптек и аптечных лавок. Автор приходит к выводу, что, получая светское медицинское образование, женщины иудейского вероисповедания делали шаг в сторону ассимиляции и эмансипации, нарушая традиционные еврейские гендерные стереотипы.*

*Ключевые слова: еврейские женщины; история медицины; еврейская медицина; повивальные бабки; фармацевты; дантистки.*

*The participation of Jewish women in medicine in Belarus in the second half of XIXth – the beginning of XX^th^ century is reviewed in the article. The archive documents from National Historical Archive in Grodno and Minsk were used as the sources for the research. In medical sphere such specialties as obstetrics, dentistry, work in pharmacies as assistants, pharmacists less were available to Jewish women. Considered legal and social – economic conditions in which women dentists, midwives, pharmacy and chemist's shops owners were used to work. The author came to the conclusion that Jewish women who accept social medical education made strep to the assimilation and emancipation, break the traditional Jewish gender stereotypes.*

*Key words: lewish women; the history of medicine; Jewish medicine; midwife; druggist; dentist.*